УДК 94(476) «1921/1939»

***В.М. Мярчук***

# ЭМІГРАЦЫЯ НАСЕЛЬНІЦТВА З ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАГА РЭГІЁНА Ў ПРАВІНЦЫІ АРГЕНЦІНЫ Ў 20–30-я гг. XX ст.

У артыкуле прадастаўлена інфармацыя аб перасяленчым руху заходнебеларускага насельніцтва ў Аргенціну ў міжваенны перыяд. Прадметам даследавання з'яўляецца эміграцыйныя працэсы 1921–1939 гг. з Заходняй Беларусі ў Аргенціну. У даследаванні прааналізавана заканадаўча-прававая база эміграцыі, дакументальна-візавае забеспячэнне і транспарціроўка эмігрантаў, статыстыка эміграцыйных рухаў, а таксама вывучана адаптацыя заходнебеларускіх эмігрантаў у правінцыях Аргенціны. Зроблена выснова аб тым, што Аргенціна з'яўлялася самай папулярнай краінай для эміграцыі заходнебеларускага насельніцтва ў 20-я гг. XX ст. Эміграцыя ў аргенцінскія правінцыі насіла пераважна аграрны характар і была прадстаўлена сельскагаспадарчымі сем'ямі і рабочымі. З Навагрудскага, Віленскага і Палескага ваяводстваў у Аргенціну выехала вялікая колькасць беларусаў ў пошуках добрага заробку і лепшай долі.

## Уводзіны

Эміграцыйныя працэсы 20–30-х гг. XX ст. адыгралі вялікую ролю ў аграрна-эканамічнай і дэмаграфічнай гісторыі Заходняй Беларусі. На працягу 1921–1939 гг. з заходнебеларускага рэгіёна выехала вялікая колькасць беззямельных і малазямельных сялян, якія імкнуліся палепшыць сваё матэрыяльнае становішча шляхам працаўладкавання за мяжой. Адной з галоўных краін эміграцыі заходнебеларускага насельніцтва ў 1921–1939 гг. з'яўлялася Аргенціна. Нягледзячы на значныя памеры эміграцыі з Заходняй Беларусі ў 1920–1930-х гг. сельскагаспадарчых і прамысловых рабочых, у айчыннай гістарычнай навуцы дадзеная праблематыка пакуль не знайшла свайго адлюстравання. Эміграцыйная праблематыка вывучалася польскімі вучонымі, аднак пытанне эміграцыі менавіта заходнебеларускага насельніцтва таксама засталося недаследаваным. Па-першае, эміграцыйныя плыні разглядаліся імі ў кантэксце агульных польскіх эміграцыйных працэсаў, а па-другое – польскія даследчыкі ў сваіх навуковых працах не вылучалі беларусаў сярод эмігрантаў як самастойны этнас (Е. Каладзей, М. Кула, А. Яцэвіч, М. Парадоўска, З. Дабасевіч, В. Румэль, Я. Влодэк і інш.) [1–6]. Менавіта таму аб'ектам дадзенага навуковага даследавання выступае эміграцыя з Заходняй Беларусі ў Аргенціну ў 1921–1939 гг., а мэтай даследавання з'яўляецца комплекснае вывучэнне польска-аргенцінскай міграцыйнай палітыкі, выяўленне статыстычных паказчыкаў эміграцыі з Заходняй Беларусі і аналіз працэсу працаўладкавання і адаптацыі перасяленцаў.

## Заканадаўча-прававая база, дакументальна-візавае забеспячэнне эміграцыі і транспарціроўка эмігрантаў у Аргенціну (1921–1939 гг.)

Асаблівае месца ў эміграцыйных працэсах Заходняй Беларусі займала эміграцыя ў Аргенціну, якая атрымала распаўсюджанне ў выніку дзяржаўнай палітыкі дзвюх краін. З аднаго боку, гаспадарчая структура Аргенціны была прадстаўлена сялянамі-арандатарамі (68 %) і земляўласнікамі (38 %): у правінцыі Буэнас-Айрэс налічвалася 985 індывідуальных гаспадарак агульнай плошчай 9 088 947 га (1/3 тэрыторыі правінцыі), з якіх 232 336 га зямлі валодалі шэсць сямей Люро, 377 999 га зямлі – 19 членаў сям'і Анчорэны; 104 621 га зямлі агульным коштам у 18 млн. песа

---

Навуковы кіраўнік – А.М. Вабішчэвіч, доктар гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна

знаходзіліся ва ўласнасці Мерсэдэс Анчорэн. Амаль палова правінцыі Санта Фэ была падзелена паміж 380 земляўласнікамі, сярод якіх вядучае месца належала англійскай кампаніі «Ля Форесталь» (838 000 га) [7, с. 3]. Такая гаспадарчая структура Аргенціны патрабавала прытоку таннай замежнай рабочай сілы, якая была прадстаўлена сельскагаспадарчымі рабочымі-эмігрантамі.

У эміграцыйнай заканадаўча-прававой базе Аргенціны галоўным з’яўляўся закон «Аб іміграцыі» № 817 ад 6 (19) кастрычніка 1876 г., які рэгуляваў працэсы і механізмы міграцыі [6, с. 334; 8, с. 110]. Закон дзейнічаў на працягу ўсяго міжваеннага перыяду і быў адным з самых ліберальных сярод краін Амерыкі. Згодна з эміграцыйным законам, у Буэнас-Айрэсе была адкрыта Генеральная іміграцыйная дырэкцыя, а ў Еўропе – шматлікія канторы па вярбоўцы мясцовых жыхароў у гэтую лацінаамерыканскую краіну[6, с. 336].

У першай палове 20-х гг. XX ст. эміграцыйная палітыка Аргенціны мела ліберальны характар, які праяўляўся ў магчымасці аплаты праезду эмігрантаў не толькі з уласных сродкаў і дзяржаўнага бюджэта Аргенціны, але і праз пасрэдніцтва прыватных мараходных прадстаўніцтваў, якія дзейнічалі ў сферы эміграцыі і каланізацыі [9, с. 139].

У 1927 г. прэзідэнт Аргенціны Марсела дэ Альвэара ў сваім выступленні адзначаў, што каланізацыя новых тэрыторый Аргенціны з’яўляецца важнай з’явай у гісторыі краю: па-першае, пачалі ствараца асадніцкія эміграцыйныя суполкі, па-другое, грамадзянства мог атрымаць кожны 18-гадовы перасяленец, які бесперапынна пражыў у краіне на працягу 2-х гадоў [10, с. 4; 11, л. 28].

З 1930-х гг. у выніку разгортвання сусветнага эканамічнага крызісу і павышэння аргенцінскіх візавых аплат ў 10 разоў (з 1 студзеня 1931 г. замест 30 аргенцінскіх песа за візу патрабавалі 300, прычым у аргенцінскіх консульствах канверсія ажыццяўлялася па самым вялікім курсе) назіраўся спад эміграцыйных плыняў з Заходняй Беларусі [12, с. 186; 13, л. 21].

У выніку станоўчай і актыўнай іміграцыйнай палітыкі аргенцінскіх улад на працягу ўсяго міжваеннага часу ў Аргенціне існавала шмат аргенцінскіх і міжнародных каланізацыйных таварыстваў і зямельных кампаній, якія ажыццяўлялі разнастайныя зямельныя аперацыі. Сярод найбольш распаўсюджаных можна выдзяліць наступныя: кампанія Казіміра Фрыча «Estacion Atahona» ў правінцыі Тукуман, Каланізацыйная кампанія «Vistula» ў правінцыях Камандзіта, Пасадас і Міс’ёнес (утворана 14 лютага 1932 г.), Марская і каланіяльная Ліга, Варшаўскае Каланізацыйнае таварыства (утворана ў 1926 г.), каланізацыйнае таварыства «Compania Colonizadora del Norte S.A.» (валодала тэрыторыяй калоніі «Ванда», якая была ўтворана ў 1936 г. для эмігрантаў з Польшчы; калонія названа ў гонар дачкі маршала Ю. Пілсудскага Ядвігі), зямельная кампанія «Eldorado Colonizacion y Explotacion de Bosques Leda» ў Буэнас-Айрэсе (карысталася падазронымі адносінамі афіцыйных польскіх эміграцыйных улад) [14, л. 2; 15, л. 1, 2, 4, 5, 9, 10; 16, л. 4].

У выніку актыўнай эміграцыйнай палітыкі Польшчы, зацікаўленасці аргенцінскіх улад у асваенні новых тэрыторый і каардынаванай дзейнасці каланізацыйных і мараходных таварыстваў эміграцыя заходнебеларускага насельніцтва ў Аргенціну атрымала небывалы размах. Пачынаючы з 1921 г. колькасць эмігрантаў, якія пакідалі родныя мясціны ў пошуках лепшай долі і выязджалі на працу ў сельскагаспадарчыя правінцыі Аргенціны, складала 2 257 чалавек, у 1922 г. – 3 311 чалавек, у 1923 г. – 4 977 чалавек, у 1924 г. – 5 590 чалавек, у 1925 г. – 8 820 чалавек. Агульная колькасць польскіх эмігрантаў за 1921–1925 гг. складала 24 955 чалавек [17, с. 113].

Паводле звестак польскай эміграцыйнай статыстыкі, эміграцыя з Польшчы ў Аргенціну атрымала самае вялікае распаўсюджанне на тэрыторыі заходнебеларускага рэгіёна (пасля тэрыторыі Заходняй Украіны): за 1927–1937 гг. у правінцыі Аргенціны выехала каля 28 тыс. чалавек: з Палескага ваяводства 11 тыс., Віленскага – 6,9 тыс., Беластоцкага – 6,7 тыс., Навагрудскага – 3,4 тыс. чалавек. У той жа час з польскіх ваяводстваў выехала толькі каля 25 тыс. чалавек [18, с. 57].

Аднак пры выяўленні статыстычных паказчыкаў эміграцыі ў Аргенціну ўзнікаюць цяжкасці, звязаныя з працэсам падліку колькасці эмігрантаў у польскіх і аргенцінскіх дзяржаўных аддзелах статыстыкі. Па-першае, аргенцінскае і польскае заканадаўства прызнавалі нацыянальную прыналежнасць эмігрантаў па той краіне, дзе яны пражывалі, і фіксавалі толькі веравызнанне; па-другое, амаль да 30-х гадоў XX ст. у Аргенціне праваслаўных прыпісвалі да рускіх, а католікаў – да палякаў. Так, калі па дадзеных польскай афіцыйнай статыстыкі агульная колькасць заходнебеларускіх эмігрантаў, якія выехалі ў правінцыі Аргенціны на працягу 1920–30-х гг., складала каля 53 тыс. чалавек, то, згодна дадзеных беларускіх даследчыкаў, на пачатку XX ст. у аргенцінскіх правінцыях пасялілася амаль 70 тыс. беларусаў, а ў 1930-х гадах іх налічвалася ўжо каля 200 тыс. чалавек [8, с. 110–115]. Статыстычныя паказчыкі аргенцінскіх улад былі яшчэ больш заніжаныя: паводле дадзеных Дырэкцыі па справах міграцыі ў Буэнас-Айрэсе, лічба эмігрантаў за 1921–1924 гг. складала толькі 4 433 чалавекі [5, с. 51].

Нелегальная агітацыя і прапаганда эміграцыі прадстаўнікамі мараходных кампаній, якія атрымлівалі 5 долараў з кожнага завербаванага эмігранта, з'явілася прычынай распаўсюджання ў Польшчы так званай «аргенцінскай гарачкі» [1, с. 96]. Збяднелае і беззямельнае насельніцтва Заходняй Беларусі распрадавала сваю маёмасць і на апошнія сродкі накіроўвалася ў аргенцінскія калоніі, дзе працэс працаўладкавання не заўжды насіў лёгкі характар. У сувязі з гэтым прадстаўнікі Эміграцыйнага ўпраўлення папярэджвалі насельніцтва, што без дастатковых матэрыяльных сродкаў на выезд эмігранты мелі вельмі малы шанец на добрае жыллёвае ўладкаванне. Толькі на перыяд жніва і збору ўраджаю, які працягваўся з лістапада па красавік, арандатары зямельных латыфундый наймалі на працу рабочых і прадастаўлялі ім жылыя памяшканні. У астатнія месяцы зямельны работнік пражываў у будынках, зробленых з дошак і кардону – «кардонных вілах» [19, с. 159]. Такім чынам, самотныя эмігранты для сацыяльнай і матэрыяльнай адаптацыі павінны былі мець на руках па 150 долараў, сем'і – па 300 долараў, сельскагаспадарчыя рабочыя на ўласнай зямлі – па 1 000 долараў [19, л. 15].

З боку аргенцінскага ўраду для імігрантаў, пазбаўленых капіталу, аказвалася дапамога ў якасці прадастаўлення падчас прыбыцця і працаўладкавання месца ў Іміграцыйнай гасцініцы Буэнас-Айрэса (на 5 дзён): у 1929 г. з Іміграцыйнай гасцініцы на працу па збору ўраджаю выехала 19 % італьянцаў, 22 % іспанцаў і 55 % імігрантаў з Польшчы. Акрамя таго, эмігранты атрымлівалі бясплатны праезд па чыгунцы да месца працы.

Асноўнымі катэгорыямі грамадзян, якія маглі эмігрыраваць у Аргенціну, былі аргенцінцы па нацыянальнасці, а таксама людзі, якія мелі «affidavit argentyński» (дазвол аргенцінскіх эміграцыйных улад на ўезд у краіну), запрашэнне, атрыманае праз польскае консульства ў Буэнас-Айрэсе, і лісты да аргенцінскага пасольства, якія выдала Яўрэйскае таварыства дапамогі эмігрантам «Soprotimis», сельскагаспадарчыя сем'і, яўрэйскія работніцы [20, л. 4].

Не маглі эмігрыраваць у аргенцінскія правінцыі хворыя, з судовым пакараннем за апошнія 5 гадоў, жабракі, асобы старэйшыя за 60 гадоў (выключэнне складалі эмігранты, якія выязджалі ў кампаніі сваякоў, якія бралі на сябе ўсе выдаткі), замужнія жанчыны без мужа і з дзецьмі да 18 гадоў, дзеці да 18 гадоў [21, с. 37–38].

У асноўным аргенцінскія візы выдаваліся людзям, якія яшчэ не дасягнулі шасцідзесяцігадовага ўзросту. Асобы старэйшага ўзросту, павінны былі мець «affidavit argentyński», які дзейнічаў на працягу аднаго года з моманту выдачы і зацвярджаўся ў польскім консульстве. Незамужнія жанчыны і жанчыны з дзецьмі да 15 гадоў таксама павінны былі прадастаўляць аргенцінскае запрашэнне. На падставе такога запрашэння інспектар Эміграцыйнага сіндыката ў Варшаве выдаваў пасведчанне на атрыманне эміграцыйнага пашпарту і аргенцінскай візы. Нярэдка неабходна было праводзіць легалізацыю дакументаў праз Эміграцыйны сіндыкат. Эміграны, якія не дасягнулі 18 гадоў, незамужнія жанчыны і людзі, старэйшыя за 60-гадоў, не маглі эмігрыраваць без суправаджэння сваякоў [22, л. 4].

Кошт аргенцінскай візы для дарослага (з 15 гадоў) складаў 305 злотых 60 грошаў, для дзецей да 15 гадоў – 43 злотыя 60 грошаў, дзеці да 1 года атрымлівалі візу бясплатна [20, л. 10; 23, л. 3].

Транспарціроўка эмігрантаў у Аргенціну ажыццяўлялася караблямі другога і трэцяга класаў сусветных мараходных кампаній «Chargeurs Reunis», «Cosulich Line», «Królewska Holenderski Lloyd», «Navigatione Generale Italiana», «Nelson Line», «Royal Mail Line», «Societe Generale de Transports Maritimes a Vapeur». Месцам адплыву караблёў былі парты Гдыня, Гданьск, Амстэрдам, Генуя, Трыест, Ліверпуль, Марсель. Кошт дарожнага білета трэцяга класа складаў 950–1030 зл. Праезд дзяцей 5–10 гадоў аплачваўся напалову, ад 1 да 5 годощ – ¼ ад агульнага кошту дарожнага білету, а дзеці да 1 года ехалі бясплатна [21, с. 42–44]. Падарожжа морам працягвалася каля чатырох тыдняў. Падчас падарожжа эмігрант меў права правесці з сабой да 150 кг багажу, які не абкладаўся дадатковым падаткам. Рэчы асабістага карыстання коштам да 400 злотых таксама падаткаабкладанню не падлягалі [24, л. 39].

## Працаўладкаванне сельскагаспадарчых і прамысловых эмігрантаў у правінцыях Аргенціны

Заходнебеларуская эміграцыя ў Аргенціну насіла пераважна аграрны характар. Акрамя сельскай гаспадаркі, перасяленцы былі заняты таксама ў прамысловасці і сферы абслугоўвання. Паводле статыстычных звестак, у 1927–1937 гг. асноўную кольскаць эмігрантаў складалі сельскагаспадарчыя рабочыя – каля 59,4 тыс. чал., у той час як прамысловых работнікаў налічвалася каля 10,4 тыс., а работнікаў сферы абслугоўвання – каля 1,2 тыс. [18, с. 56]. Такая сітуацыя на працоўным рынку Аргенціны была характэрнай на працягу ўсяго міжваенага перыяду: перавага надавалася сельскагаспадарчаму накірунку працы, якая заключалася ў апрацоўцы зямлі, зборы ўраджаю, працах на плантацыях матэ, цукровага трыснягу і інш. [4, с. 27].

Прамысловасць у Аргенціне была слабаразвітай, таму прамысловая эміграцыя не была асабліва распаўсюджанай сярод эмігрантаў з Заходняй Беларусі [11, л. 75]. Насельніцтва, якое накіроўвалася ў гарады Аргенціны, працаўладкоўваліся на невялікія заводы і фабрыкі. Штодзённая заработная плата эмігрантаў на прадпрыемствах Буэнас-Айрэса складала ў сярэднім 6,5 песа: для столяра – 6,77 песа, гарбарнага рабочага – 6,7 песа, электрамеханіка – 6,33 песа, каваля – 6,62 песа, механіка – 6,71 песа, паліроўшчыка мэблі – 8,16 песа, маляра і трактарыста – 6,55 песа [11, л. 79]. Аплата працы была невялікай, а ў выпадках неабходнасці арэнды пакою, за які ў месяц у сярэднім прыходзілася плаціць па 32–52 песа, яна ўвогуле была нязначнай [21, с. 20]. Дзённая аплата працы сельскагаспадарчых рабочых у сярэднім складала 6–8 песа, пры зборы кукурузы – 4 песа, цукравага трыснягу – 9–12 песа. Аднак аплата жаночай працы была ніжэйшай прыкладна на 2 песа. Па дадзеных Дырэкцыі статыстыкі, прыбыткі сельскагаспадарчых рабочых і іх сямей складалі ў 1923 г. 2 516 песа [21, с. 19].

Прамысловым работнікам каменаломняў у дзень плацілі па 3,5, а чугуначнікам – па 2,4–3,5 песа. Становішча жанчын-эмігрантак на прамысловых прадпрыемствах было даволі складаным: акрамя нізкай заработнай платы і дрэнных умоў працы, назіраліся дыферэнцыраваныя адносіны да эмігрантаў [25, с. 4]. Напрыклад, у прэсе неаднаразова адзначалася складанае палажэнне эмігрантак на мясным індустрыяльным сіндыкаце «Ля Блянка» ў горадзе Фрыгарыфіка [26, с. 5].

Параўнанне штомесячных прыбыткаў прамысловых і сельскагаспадарчых работнікаў паказвае, што яны ў сярэднім атрымлівалі аднолькавую заработную плату: месячная заработная плата каваля складала 80–90 песа (без уліку выдадкаў на ўтрыманне), сельскагаспадарчага работніка з жонкай-кухаркай – 90–100 песа [11, л. 89].

Для больш яскравага ўяўлення аб заработнай плаце заходнебеларускіх эмігрантаў прывядзём кошты прадуктаў першай неабходнасці ў Буэнас-Айрэсе (1 кг): хлеб каштаваў 35–40 санцісімаў, мяса – 55–62, бульба – 8–12, соль – 10–15, цукар – 35–38, рыс – 40–43; за 1 літр малака плацілі 20 санцісімаў, а дзесятак яек – 8–9. Рабочая вопратка ў сярэднім каштавала каля 80 песа, а абутак ад 13 да 50 [21, с. 22].

Уся зямельная ўласнасць у Аргенціне падзялялася на прыватную і дзяржаўную. 1 га зямлі ў сярэднім каштаваў 1–2 долара, ў правінцыі Місьёнес – 9,27 долара. На сельскагаспадарчую сям'ю адводзілася па 25–50 га ў правінцыі Місьёнес, у правінцыі Чака і Фармоса – па 50–100 [19, л. 12]. Пры пакупцы зямлі давалася адтэрміноўка на 6 гадоў, аднак на працягу двух гадоў неабходна было пабудаваць дом, пасадзіць некалькі дрэваў, выкарыстаць у зямельнай гаспадарцы не менш за 50 % канцэсіённай зямлі. Прадаваць такую зямельную гаспадарку было забаронена. Прыватная зямля была даражэйшай і каштавала 150–600 песа за 1 га, аднак на пакупку такой зямлі магчыма было атрымаць фінансавую дапамогу ад Іпатэчнага банку, які прадастаўляў 80 % аплаты на крэдытных умовах [19, л. 13].

Спачатку беларусы разам з рускімі і ўкраінскімі пасяленцамі асвойвалі пампу – паўднёваамерыканскую зямлю з неабсяжнымі прасторамі нявыкарыстаных ўрадлівых зямель. Аргенцінскія ўлады ўсяляк заахвочвалі «аграіміграцыю», бо яшчэ ў 1880-х гадах было афіцыйна заяўлена аб намеры пераўтварыць Аргенціну ў аднаго з сусветных лідэраў па вытворчасці і экспарце сельскагаспадарчых прадуктаў. Гэтая задача была вырашана за 20–25 гадоў у значнай ступені дзякуючы заходнебеларускім перасяленцам [8, с. 110–115].

Эмігранты, якія накіроўваліся ў Аргенціну, рассяляліся амаль па ўсёй тэрыторыі краіны, аднак найбольш шчыльная канцэнтрацыя назіралася ў Буэнас-Айрэсе, правінцыях Буэнас-Айрэс і Місьёнес, Парана, Чака, Мендоза, Тукуман, Санта Фэ, Рыа Негра, Фармоса, Карыентэс, Кардоба [22, л. 160]. У 1929 г. вялікая колькасць каланістаў назіралася ў правінцыях Місьёнес – каля 20 000 чалавек, Санта Фэ – 8 000, Кардоба – 7 000, Буэнас-Айрэс – 6 000, Тукуман – 3 000, Мендоза – 1 000 [27, л. 2]. Эміграцыйная палітыка аргенцінскіх уладаў складалася такім чынам, што правінцыя Місьёнес стала месцам пасялення для палякаў, а Тукуман і Кардоба – для меншасцяў з Польшчы [28, л. 100; 29, л. 14].

Адной з найбольш папулярных правінцый Аргенціны, куды эмігрыравала насельніцтва з Заходняй Беларусі, была Кардоба [30, л. 7–9]. Транспарціроўка эмігрантаў у Кардобу была калектыўнай і адбывалася ў тэрміны, устаноўленыя Эміграцыйным сіндыкатам. Да выезду эмігранты падрыхтоўвалі ўсе неабходныя дакументы і запаўнялі анкеты на выезд у калонію прадпрымальнікаў Я. Палацыо і П. Зукермана. У цэнтральнай і ўсходняй частках Кардобы пераважалі раўнінныя і стэпавыя землі. Менавіта ў гэтых раёнах найбольш спрыяльным заняткам было земляробства. Чацвёртая частка ўсіх зямель Кардобы была пакрыта лясамі. Галоўным заняткам насельніцтва гэтых тэрыторый з'яўлялася земляробства і жывёлагадоўля.

У 1929 г. 2 млн 172 тыс. га зямлі было выдзелена пад пасевы пшаніцы, 2 млн га – пад люцэрну, 609 тыс. га – пад кукурузу, 79 тыс. га – пад садавіну. У жывёлагадоўлі найбольшае распаўсюджанне атрымала развядзенне буйной рагатай жывёлы. Па статыстычных дадзеных 1929 г., у правінцыі Кардоба гадавалася 4 млн 104 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы, 775 тыс. авечак, 211 тыс. свіней, 1 млн. 300 тыс. коней, 821 тыс. коз і інш. [31, л. 37].

Асноўная частка эмігрантаў, якія выязджалі ў правінцыю Кардоба, працаўладкоўвалася на прадпрыемствы і землі каланіяльных інжынераў Юйосе Палацыо і Педро Зукермана, якія знаходзілася ў 14 гадзінах падарожжа на цягніку ад Буэнас-Айрэса ў акругах Тотурал, Талумба, Рыа Сека і Кандэлярыя. У першыя месяцы побыту дазвалялася вывозіць лес на продаж, а грошы, атрыманыя ад продажу драўніны, накіроўваліся на добраўпарадкаванне гаспадаркі. Да моманту пабудовы каланістамі на набытай зямлі дому ці памяшкання адміністрацыя калоніі бясплатна засяляла іх у гігіенічныя баракі [31, л. 44].

Сем'і каланістаў у асноўным складаліся з трох асоб, двое з якіх павінны былі быць здольнымі да сельскагаспадарчый працы. Зямельны надзел ў памеры 33 га набывалі актам куплі-продажу, які заключаўся паміж каланістам і каланіяльнымі прадстаўнікамі. Кошт зямлі залежаў ад адлегласці надзела да чугуначнай станцыі і ў сярэднім складаў 80–100 аргенцінскіх песа за 1 га [31, л. 45]. Першапачатковы грашовы ўзнос раўняўся 330 песа, астатак падзяляўся на чатыры роўныя часткі і выплачваўся пасля трэцяга году побыту. Ад сумы, якую павінен быў выплаціць каланіст, бралася дадатковая плата ў памеры 7 %, якая падлягала аплаце пасля трох гадоў. Зямельны надзел каланіста павінен быў быць ачышчаны ад лесу на 1/3 ад усёй тэрыторыі і мець дастатковую меліярацыю. Каланіст ці сям'я каланіста абавязваліся вычысціць і ўпарадкаваць болей 2/3 агульнай тэрыторыі зямельнага надзелу на працягу першых двух гадоў. Сям'я эмігранта павінна была мець 60 песа на першыя тры месяцы пражывання. Кожны каланіст павінен быў набыць у адміністрацыі калоніі на суму 120 песа, якія выдаваліся наяўнымі грашыма пры выплаце кошту за карабельны білет, 2-х рабочых коней, карову і 2-х свіней [30, л. 9].

Кошт карабельнага білета да Буэнас-Айрэса для членаў сельскагаспадарчых сямей складаў 75 дол. з кожнага дарослага чалавека. Аргенцінская віза для такіх асоб была па 5 дол. (43 злотых 70 грошаў). Блізкія сваякі плацілі па 35 амерыканскіх долараў з асобы (305 злотых 60 грошаў) [23, л. 42а]. Праезд з Буэнас-Айрэса да зямельнага надзела для сям'і каланістаў быў бясплатны. Перасяленцам дазвалялася браць з сабой багаж, які не перавышаў 100 кг на кожны карабельны білет. Такім чынам, акрамя грошай на дарожны білет і аргенцінскую візу, сям'я каланістаў, якая накіроўвалася ў Кардобу з мэтай уладкавання на зямлі, павінна была мець 330 песа на зямлю, 120 песа на закупку інвентару, 60 песа на першыя месяцы побыту [31, л. 36].

У правінцыі Місьёнес існавалі калоніі «Азара» польскага таваарыства імя Я. Сабескага, калонія «Корпус» польскага таварыства імя Ю. Пілсудскага, калонія «Пасадас», «Cerro Cora», «San Josse», «San Javier», «Bompland» і інш. [21, с. 35]. У Паўднёвай Аргенціне (Патагонія) распаўсюджанымі сельскагаспадарчымі тэрыторыямі былі Тэрыт і Рыа Нэгра, якія размяшчаліся ў даліне ракі Рыа Нэгро і працягваліся ўздоўж чыгуначных станцый В'едма – Сан Антоніо, Кармэн дэ Патагонес – В'едма, Сан Антоніо – Барілоче [32, с. 61].

Санітарная апека ў сельскагаспадарчых калоніях Аргенціны і медыцынскае абслугоўванне рабочых было на нізкім узроўні. У сакавіку 1927 г. у федэральнай калоніі Кандзіду-дзі-Абрэў, дзе размяшчалася каля 200 сямей эмігрантаў, успыхнула эпідэмія малярыі, у выніку якой за тыдзень памёрла 7 чалавек [33, с. 2–3; 34, л. 3].

**Грамадская і сацыяльна-культурная дзейнасць перасяленцаў у Аргенціне**

Польскае пасольства, консульства і патранат ў Буэнас-Айрэсе, а таксама польскія таварыствы (Саюз польскіх таварыстваў і арганізацый у Аргенціне, таварыства «Польскі дом», таварыства «Вольная Польшча») займаліся каардынацыяй сацыяльнай апекі эмігрантаў [23, с. 33]. 1 снежня 1931 г. у Буэнас Айрэсе быў адкрыты філіял Польскай касы апекі – «Banko Polacy Polska kasa opieki» [35, л. 1].

Грамадскае і сацыяльна-культурнае жыццё беларусаў у Аргенціне адбывалася ў цесным кантакце і сувязі з прадстаўнікамі ўкраінскай эміграцыі. У 1920-я гг. быў створаны Аргенцінскі саюз беларускіх і ўкраінскіх рабочых арганізацый, які ў канцы 1930-х гадоў быў расфарміраваны. У 1925 г. было падпісана пагадненне аб узаемадзеянні беларускай і ўкраінскай дыяспар Аргенціны. Абедзве дыяспары разам дабіваліся ад аргенцінскіх улад сацыяльнай дапамогі, ліквідацыі дыскрымінацыі пры працаўладкаванні, атрыманні вышэйшай адукацыі, надзялення часовым бясплатным жыллём, ільгот на плацяжы за выдавецкую, культурна-асветную, гуманітарную дзейнасць. Былі пацверджаны правы пажылых (больш за 65 гадоў) беларускіх, украінскіх і расійскіх эмігрантаў, што былі бежанцамі ці перамешчанымі асобамі [8, с. 114].

Сярод тых, хто выехаў у Аргенціну ў 1925–1939 гг., былі прадстаўнікі і члены Кампартый Заходняй Беларусі. Менавіта таму першае нацыянальнае незалежнае беларускае культурна-асветніцкае таварыства, якое было заснавана ў снежні 1934 г., насіла назву «Беларуская грамада». У 1930-я гады былі заснаваны таксама таварыствы «Культура», «Бібліятэка імя І. Луцкевіча», «Белавежа». Гэтыя чатыры таварыствы ў 1939 г. аб'ядналіся ў Федэрацыю беларускіх арганізацый у Аргенціне. У склад Управы федэрацыі ўвайшлі Міхась Мярэчка, Уладзіслаў Гайлевіч, Пятрушак і іншыя. Сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя бакі жыцця эмігрантаў з Заходняй Беларусі асвятляліся ў часопісах «Голас польскі» і «Эмігрант у Аргенціне», якія выдаваліся ў Буэнас-Айрэсе [8, с. 115].

У беларускіх асяродках праводзілася мастацкая аматарская работа. Эмігранцкая і аргенцінская публіка ўпершыню ўбачыла спектакль на беларускай мове «Мікітаў лапаць», пачула беларускія песні і вершы, танцы. Мастацкі гурток культурна-асветніцкага таварыства «Бібліятэка імя І. Луцкевіча» апрача выступленняў у Нацыянальным тэатры Буэнас-Айрэса і правінцыях Аргенціны выязджаў таксама на гастролі ў суседні Уругвай.

У таварыствах працавалі курсы арыфметыкі, бухгалтэрыі, іспанскай мовы, збіраліся кнігі для грамадскіх бібліятэк. Камісія Федэрацыі па справах культуры наладзіла ў 1939 г. выданне «Белорусского иллюстрированного календаря» на рускай мове. На жаль, беларуская эміграцыя ў большасці сваёй не выкарыстоўвала родную літаратурную мову [8, с. 115].

Нягледзячы на станоўчыя моманты эміграцыйных працэсаў, амаль усе эмігранты не ведалі мовы, мясцовых законаў, назіралася адарванасць ад аргенцінскага рабочага класа, а таксама адсутнасць элементарных палітычных правоў – гэта ўскладняла цяжкае сацыяльна-эканамічнае і культурнае становішча заходнебеларускіх перасяленцаў, асабліва на працягу першых гадоў эміграцкага жыцця.

**Заключэнне**

Такім чынам, масавая эміграцыя беларусаў у Аргенціну на працягу 1920–30-х гг. прывяла да таго, што напярэданні Другой сусветнай вайны былі сфарміраваны каланіяльныя асяродкі заходнебеларускіх эмігрантаў у Буэнас-Айрэсе, Кардобе, Місьёнесе, Тукумане, Чака і іншых рэгіёнах гэтай краіны. Закон «Аб іміграцыі» ад 6 (19) кастрычніка 1876 г. быў галоўным іміграцыйным юрыдычным дакументам Аргенціны, а Генеральная іміграцыйная дырэкцыя з'ялялася цэнтральнай ўстановай,

якая рэгулявала міграцыйныя працэсы. На працягу 1921–1939 гг. з тэрыторыі Заходняй Беларусі выехала ў правінцыі Аргенціны каля 53 тысяч чалавек. Эміграцыя насіла пераважна аграрны характар і была прадстаўлена сельскагаспадарчымі сем'ямі і рабочымі. Для большасці эмігрантаў набыццё зямельнага надзела з'яўлялася складанай задачай па прычыне высокага кошту зямлі: толькі 30 % эмігрантаў маглі набыць зямельныя надзелы. Акрамя таго, у большасці выпадкаў для каланізацыі вылучаліся аддаленыя незаселеныя тэрыторыі ў трапічным лесе з дзяржаўнага зямельнага фонду. Цяжкасці з набыццём зямлі, якая ў асноўным знаходзілася ў руках латыфундыстаў, прывялі да распаўсюджання арэнднай формы землеўладання. Адаптацыя эмігрантаў была складанай, яна залежала ад сацыяльных і эканамічных умоў працы. Аргенцінскія прадпрымальнікі эксплуатавалі эмігрантаў шляхам інтэсіфікацыі працы, павелічэння працягласці працоўнага дня, эканоміі пры жыллёвым будаўніцтве, забеспячэнні аховы працы і сацыяльным страхаванні.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Kołodzej, E. Wzchodźstwo zarobkowe z Polski. 1918–1939 / E. Kołodzej. – Warszawa : Książka i wiedza, 1982. – 291 s.
2. Kula, M. Dzieje Polonib w Ameryce Łacińskiej / M. Kula. – Wrocław – Warszawa–Kraków–Gdańsk–Łódź : Zakład narodowy im. Ossolińskich, 1981. – 484 s.
3. Jacewicz, A. Santa Rosa / A. Jacewicz. – Lonynie : Veritas. – 1934. –74 s.
4. Paradowska, M. Podróżnicy i emigranci / M. Paradowska. – Warszawa : Interpress, 1984. –218 s.
5. Polonia w Ameryce Łacińskiej / Red. nauk. Z. Dobosiewicz, W. Rómmel. – Warszawa : –248 s.
6. Włodek, J. Argentyna i emigracja / J. Włodek. – Warszawa : M. Arcta, 1923. – 516 s.
7. Кризис в цифрах // Рабочая правда. –1933. – 1 октября.
8. Беларуская дыяспара : нарысы гісторыі і сучаснага стану / М.М. Бацян [і інш.] / Мінск : БДУ, 2006. – 160 с.
9. Emigracja z ziem polskich w czasach nowożytnych i najnowszych (XVIII–XX) / Pod. red. A. Pilcha. – Warszawa : Państwowe wyd-wo Naukowe, 1984. – 537 s.
10. Głos. – 1927. – 5 сакавіка.
11. Archiwum Akt Nowych (AAN). – Zespół MSZ. – K. 9792.
12. Janowska, H. Emigracja zarobkowa w Polsce. 1918–1939 / H. Janowska. – Warszawa. – 186 s.
13. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9796.
14. Лісты Галоўнага эміграцыйнага ўпраўлення ў Варшаве, польскага пасольства ў Аргенціне і польскага патронату ў Іспаніі аб папярэджанні эмігрантаў аб карыстанні паслугамі каланізацыйнага таварыства «Эльдарада» ў Аргенціне (1931) // Дзяржаўны гістарычны архіў у г. Львове (ДГАЛ). – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 607.
15. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9790.
16. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9777.
17. Szawleski, M. Kwestja emigracji w Polsce / M. Szawleski. – Warszawa : Polske Towarzystwa Emigracyjne, 1927. – 208 s.
18. Mały rocznik statystyczny. – Warszawa, 1938. – 406 s.
19. AAN. – Zespół MSZ. – K. 9616.
20. Цыркуляры і ўказанні эміграцыйнага сіндыкату аб эміграцыі ў Аргенціну і Бразілію // Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 2082. – Воп. 1. – Спр. 9.
21. Wskazówki dla wychodźstwa do Argentyny (Mała biblioteka emigranta polskiego № 2). – Warszawa, 1929. – 64 s.

22. Брашура мараходнага таварыства «Галандска-каралеўскі Лойд» аб умовах эміграцыі ў Аргенціну, Бразілію, Уругвай пры пасрэдніцтве дадзенага таварыства // ДГАЛ – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 558.

23. Цыркуляры Эміграцыйнага сіндыкату і перапіска з ім па пытаннях дзейнасці аддзелаў // ДАБВ – Фонд 2082. – Воп. 1. – Спр. 3.

24. Цыркуляры і пастановы Эміграцыйнага сіндыкату па пытаннях эміграцыі // ДАБВ – Фонд 377. – Воп. 1. – Спр. 2.

25. Слово женщины работницы // Рабочая правда. –1933. – 1 октября.

26. Как эксплуатируют рабочих женщин в г. Фригорифрика на фабрике «Ля Блянка» // Рабочая правда. – 1933. – 9 июля.

27. AAN – Zespół MSZ. – К. 9577.

28. AAN – Zespół MSZ. – К. 9617.

29. AAN – Zespół MSZ. – К. 9794.

30. Інфармацыйныя бюлетэні Эміграцыйнага сіндыкату ў Варшаве (1932) // ДГАЛ – Фонд 799. – Воп. 1. – Спр. 9.

31. Цыркуляры Эміграцыйнага сіндыкату // ДАБВ. – Фонд 377. – Воп. 1. – Спр. 1.

32. Kwartnik Instytutu Naukowego do badań emigracyjnych i kolonizacyjnych. – 1928. – Т. 2, 3.

33. Wychodźstwo. – 1927. – № 18.

34. AAN. – Zespół MSZ. – К. 9799.

35. Лісты Галоўнага эміграцыйнага ўпраўлення ў Варшаве аб адкрыцці філіяла Польскай касы апекі ў Аргенціне (1931) // ДГАЛ – Фонд 422. – Воп. 1. – Спр. 608.

***Miarchuk V.M.*** **Emigration of the Population from the Territory of West Belarus Region in the Province of Argentina in the 20-30s of the XX Century**

In the article the information about the population movement to Argentina during the intermilitary perioв is presented. The subject of this survey is the migratory process of the 1921s–1939s from Western Belarus. In the research the documentary-legal base of emigration, the visa policy and transportation, and the statistics of emigratory processes, and also adaptation of West Belarus emigrants in the provinces Argentin is analyzed. The conclusions is made that in search of good salary and the best destiny a considerable quantity of Western Belorussians left for Argentina – the country which was the most popular among emigratory directions of the 20s–30s of the XX century.The emigration to Argentina provinces was mostly of agrarian character and was presented by agricultural families and workers. From the territory of Novogruskaye, Vilenskaye, Polesskaye, Belastokskaye vojevodstva a considerable quantity West Belarusian emigrants in search of better life went to Argentina.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 25.11.2011